# ЖАНОЧЫЯ ВОБРАЗЫ Ў ПАЭЗІІ У. ДУБОЎКІ

**І. І. Шматкова[1], А. Р. Кухальская[2]**

*[1] Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, i.shmatkova@gmail.com;
[2] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, nastakukhalskaa@gmail.com;
Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт І. І. Шматкова*

Акрэсліваецца месца жаночых вобразаў у шматграннай вобразнай сістэме паэзіі У. Дубоўкі, выяўляюцца фальклорныя асновы фарміравання дадзенага тыпу вобразаў, прасочваецца іх функцыянаванне ў розныя перыяды творчасці паэта, выяўляецца іх роля ў раскрыцці ідэйна-тэматычнага зместу лірычных твораў, у пашырэнні іх жанрава-стылёвай разнастайнасці.

***Ключавыя словы:*** жаночыя вобразы; паэзія; У. Дубоўка; ідэйна-тэматычны змест; жанрава-стылёвая разнастайнасць.

# ЖЕНСКИЕ ОБРАЗЫ В ПОЭЗИИ В. ДУБОВКИ

**И. И. Шматкова[1], А. Р. Кухальская[2]**

*[1] кандидат филологических наук, доцент, Белорусский государственный университет,
пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, i.shmatkova@gmail.com;
[2] Белорусский государственный университет,
пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, nastakukhalskaa@gmail.com;
Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент И. И. Шматкова*

Подчеркивается место женских образов в многогранной образной системе поэзии В. Дубовки, выявляются фольклорные основы формирования данного типа образов, прослеживается их функционирование в разные периоды творчества поэта, проявляется их роль в раскрытии идейно-тематического содержания лирических произведений, в расширении их жанрово-стилевого разнообразия.

***Ключевые слова:*** женские образы; поэзия; В. Дубовка; идейно-тематическое содержание; жанрово-стилевое разнообразие.

# WOMEN’S IMAGES IN THE POETRY OF U. DUBOVKA

**I. I. Shmatkova[1], A. R. Kuhalskaya[2]**

*[1] PhD, Ass. Professor, Belarusian State University,
4 Independence Ave., 220030, Minsk, Belarus, i.shmatkova@gmail.com;
[2] Belarusian State University,
4 Independence Ave., 220030, Minsk, Belarus, nastakukhalskaa@gmail.com;
Supervisor – PhD, Ass. Professor I. I. Shmatkova*

The article outlines the place of female images in the multifaceted figurative system of U. Dubovka's poetry, reveals the folklore foundations of the formation of this type of images, traces their functioning in different periods of the poet's work, reveals their role in revealing the ideological and thematic content of lyrical works, in expanding their genre and style diversity.

***Keywords:*** female images; poetry; U. Dubovka; ideological and thematic content; genre and style diversity.

У. Дубоўка сцвердзіў сябе ў беларускай культуры як выдатны паэт, пісьменнік, перакладчык, мовазнаўца, адзін з лідараў літаратурна-мастацкага аб'яднання «Узвышша». Найбольш актыўны і плённы перыяд творчасці У. Дубоўкі прыпадае менавіта на маладыя гады, перыяд перад высылкай (1921–1930). У гэты час з-пад яго пяра выходзяць паэтычныя зборнікі «Строма» (1923), «Наля» (1927), паэмы «Кругі» (1927), «І пурпуровых ветразей узвівы» (1929) і інш. Вобразная сістэма творчасці паэта надзвычай шматгранная, але адны з самых захапляльных – жаночыя вобразы.

Упершыню мы сустракаем мілы вобраз дзяўчыны ў дэбютным зборніку У. Дубоўкі «Строма», а канкрэтна толькі **ў адным вершы** – «Не жальбую...». Тут не згадваецца імя музы паэта, аўтар называе яе **тая**, **яна** – быццам штосьці далёкае: *«Пачакаю, пашукаю пільна* ***тую****, // Ад якой я буду зноўку маладым...»* [1, с. 17]. Юны аўтар глядзіць у будучыню з надзеяй, марыць знайсці спадарожніцу жыцця, якая зможа дайсці з ім да глыбокай старасці, быць вернай. Для Дубоўкі яна асаблівая. Нездарма паэт так прыгожа піша пра яе з'яўленнне: *«Яна прыйдзе вольным гоманам сасонкі, // Яна прыйдзе, бы вяночак дзіўных мар...»* [1, с. 17]. Цікава, што ў пазнейшай рэдакцыі (хутчэй за ўсё зменены ў 60-я гг. XX ст. – у гэты час паэт актыўна перапісваў свае раннія творы) верш зусім не пра чаканне прыходу каханай – ён пра «акрасу» – радасць жыцця: *«Пашукаю і знайду акрасу, // што да новых прывядзе ўзлётаў...»* [2, с. 17]. Мара пра верную і каханую жанчыну ажыццявілася: ёй стала прыгажуня Марыя Кляус, якая, як жонкі дзекабрыстаў, паехала за мужам у высылку і разам з ім перажыла ўсе жахі лагернага жыцця.Чаму Дубоўка піша менавіта пра «акрасу»? Амаль 27 гадоў у высылцы, цяжкая фізічная праца ўдалечыні ад радзімы, трагічная смерць сына і інш. – усё гэта моцна адбілася на лёсе і поглядах паэта. Пасля перажытага, вядома, захацелася адчуць подых лёгкасці, спакою, гармоніі.

У другім паэтычным зборніку «Трысцё» жаночыя вобразы сустракаюцца **ў сямі творах**. Адбываюцца пэўныя змены ў адлюстраванні дзяўчыны. Тут яна ўжо не мара, уяўленне, а рэальнасць. Вобраз мяняецца нават у тым, як Дубоўка называе яе. Напрыклад, у вершы «Ты руку сваю забінтавала» дзяўчына – **ты**, **маладая**: *«****Ты*** *руку сваю забінтавала, //* ***маладая****... як цябе і клікаць?..»* [3, с. 14]. Асноўныя матывы твора – перажыванні аб злых людскіх плётках: *«прытуліся... Хай гавораць людзі: // словы іх, як палыновы воцат, // зьвінавацяць і мяне у блудзе...»* [3, с. 14]. Аўтар паказвае гераіню чуллівай, шчырай і нават наіўнай. Яшчэ адзін верш зборніка – «Змрок імклівіў» – расказвае пра сумнае, страшнае здарэнне ў жыцці адной дзяўчыны і пра тое, як яна гэта перажывае: *«Спахмурнелі сінія вочы дзяўчыны, // бы туману сьцюдзёныя столкі...»* [3, с. 21]. У творы для перадачы настрою гераіні аўтар выкарыстоўвае сімвалы: *«Засьпявай хоць вярбу над вадою...»; «ты сьпявала каліну калісьці...»* [3, с. 21]. Вярба – гэта сімвал плачу, смутку, а каліна – прыгажосці і кахання. Дубоўка

паказвае дзяўчыну вельмі жывой, са сваімі перажываннямі і праблемамі. У гэтых двух вершах сам паэт паўстае надзейным і добрым хлопцам, які заўсёды падставіць сваё моцнае плячо.

У вершы «Нафарбавала навошта вусны» таго ж зборніка паэт натхняецца незвычайнай прыгажосцю дзяўчыны: *«Шэнціла ж косы табе рассыпаць // чорна-сіняй, ня наскай кудзелі...»* [3, с. 25]. Але Дубоўка адчувае яе недасягальнасць: *«Можа, мне* ***сьнішся і ты****, і горад, //* ***сьніцца адзін раз – прыгожа сьніцца****!..»*; *«Гэта дзяўчына зусім* ***чужая****, // а* ***я*** *– таксама* ***ня свой дзяўчыне****...»; «дык прытулі* ***мужыцкага сына****...»* [3, с. 24–25]. Тут жаночы вобраз набывае адценне хітрасці, гарэзлівасці, какетлівасці; для перадачы сілы жаночых чараў паэт выкарыстоўвае традыцыйныя фальклорныя вобразы: *«Рукі заломіць, паўзе вужакай, // быццам з марскога дна багавіньне...»* [3, с. 24].

У зборніку «Трысцё» ёсць невялікая паэма ў стылі народнай легенды, каторая так і называецца «Дзяўчына». У. Дубоўка такім чынам паказвае яе вобраз: *«Красуня-Дзяўчына! у вочах блакіт, // а твар бель-ірдзельнай, вазёрнай лялеі... // Красуня-Дзяўчына! – вянок, васількі; // з іх водарыць дзіўным алеем...»* [3, с. 33]. Тут у жаночым вобразе ўвасабляецца Беларусь, да якой заляцаліся «два хлопцы»: адзін з усходняга боку, другі – з заходняга. У паэме У. Дубоўкі, напісанай у 1922 г., абодвух каханых, якія загінулі, хаваюць на адной гары, дзе яны нарэшце прымірыліся.

Ёсць у зборніку яшчэ адна народная легенда, якая расказвае пра паходжанне назвы горада Брагін – «Бра…гінь…». У цэнтры сюжэта – заляцанне пана да вясковай дзяўчыны Алесі, браты якой былі катэгарычна супраць такога саюзу, таму ім прыйшлося ўцякаць ад панскіх коняў. Нечакана адзін брат трапіў у балота і загінуў, а другі змог уратавацца. Вобраз Алесі паказвае бяздольнасць, немагчымасць супрацьстаяць жыццёвым рэаліям, пакорлівасць, сціпласць.

У паэме «Студэнт» У. Дубоўка адкрывае перад намі ўжо іншы жаночы вобраз: вобраз маці, сын якой стаў камуністам. Хлопец апантана расказвае ёй пра новы лад жыцця, калектыўную працу на карысць краіны. Урэшце, ён адпраўляецца вучыцца ў Маскву. Але сэрца матулі заўсёды чуйнае, тужыць па дзецях: *«Дзе ты, матуля, дзе ты, старая, // пэўна, чакаеш, вернецца сын? // Гэта ты на шляхі паглядаеш... // Не, не палічыш ты дзён і гадзін...»* [3, с. 50]. Пакуль студэнт далёка асвойвае навукі, няшчасную старую пабіў да смерці панскі пастарунак за тое, што яе сын камуніст. Апошнім воклічам старой сталі наступныя словы: *«Сынку, сынку... Ня чуеш, далёкі... // Каласочак... канаю... даруй...»* [3, с. 51]. Вобраз маці – самаахвярны, выражае вялікую любоў да сына.

У паэме «Кляновыя лісты» сустракаюцца два жаночыя вобразы: маці і дачка Ганна. Апісваецца толькі дзяўчына: *«У Ганны, ой! сінія вочы, // у Ганны, ой! русыя косы...»* [3, с. 74]. Маладая паўстае перад намі сапраўднай прыгажуняй, але ёсць адзін момант: *«Палатаная скрозь спадніца, // нібы у нядольлівых кратах...»* [3, с. 75]. Жывуць яны з маці вельмі бедна. Старая просіць дачку прынесці кляновых лістоў, каб зімой было на чым пячы хлеб. Дарэчы, у Дубоўкі кляновыя лісты (альбо проста лісты) – сімвал даволі часты. Вось што пра яго У. Дубоўка пісаў у аўтабіяграфіі: *«Дарэчы, калі я ў адным вершы («Крыху восені і жменька кляновых лістоў») згадаў пра кляновыя лісты, дык адзін «крытык» усё пяўся вытлумчыць іх як нешта вельмі шкоднае. Ён, не ведаючы беларускага жыцця, зусім не разумеў, што кляновыя лісты*

*гэта не толькі сімвал разлукі, як у японскй паэзіі, але і сімвал беднасці»* [4]. Жыццё дзяўчыны крута мяняецца пасля ўступлення ў камсамол, новы лад жыцця – асноўная тэма твора.

Наступны паэтычны зборнік Дубоўкі «Credo» таксама ўключае ў сябе жаночыя вобразы – **у сямі творах**. Гэта вобразы маці, каханай дзяўчыны... Вобраз маці сустракаецца ў вершы «Нікне ўсё ў нейкай шэрай мгле», але вельмі ўскосна – толькі згадваецца. Асноўны матыў твора – змена сацыяльнага становішча сына: *«маці... маці... родная матуля... // Кажуць мне, што я інтэлігэнт, // бо на мне цяпер – // ня зрэбная кашуля...»* [5, с. 7]. Да маці паэт ставіцца вельмі паважна, ласкава называе яе «родная матуля», «любая матуля». У. Дубоўка, адлюстроўваючы сябе ў вобразе лірычнага героя, перажыве, як яна паставіцца да зменаў у ім. Аўтар баіцца страціць сувязь з зямлёй, адкуль пайшоў у свет, у канцы верша рытарычнае пытанне: *«І мяне твае палеткі // ласкава прытуляць?!»* [5, с. 8]. Тут важна згадаць саму маці паэта – Анастасію Іванаўну (у дзявоцтве Гайдуке(о)віч), пра якую паэт пісаў так: *«Маці мая была непісьменная, але мела ясны прыродны розум, вельмі добра ведала беларускую мову і, паўжыцця пражыўшы ў Маскве, гаварыла толькі па-беларуску. Я ніколі не вучыўся ні ў якіх беларускіх школах, усё маё веданне беларускай мовы – ад маці і з вёскі. Вось чаму я маю поўную падставу называць беларускую мову – матчынай мовай»* [4].

Чароўна вобраз дзяўчыны падаецца ў вершы «Вы мелодый не слухаеце»: *«Вочы... ну зірні дзяўчыне // ў вочы. Глыбіня – як жыцьцё прадоннае...»; «каб забыцца аб стройным стане. // Тыя цудоўна-русыя косы // завівацца не перасталі...»* [5, с. 13]. У творы аўтар не проста выказвае захапленне маладой, а пераплятае, нітуе вобразы радзімы і сваёй каханай: *«Так, здаецца, абняў бы аберуч // і жыцьцё, і лясы, і дзяўчыну...»* [5, с. 13].

Ёсць у Дубоўкі і вершы пра расстанне з любай, як, напрыклад, «Дзіваваўся і так кахаў». Пры гэтым ён не злуецца на дзяўчыну, не выказвае негатыву, а вельмі цёпла апісвае ўспаміны былых сустрэч: *«Дзіваваўся і так кахаў, – // наглядзецца ня мог калісьці. // Зубцамі чорных валос – галава // васільком здавалася шалясьцістым...»* [5, с. 16].

Прыгожае, вобразнае апісанне дзяўчыны Дубоўка дае ў вершы «Я шкадую ўсё ж ткі сябе», у якім расказвае пра тое, як ён спазнаў светлае пачуццё кахання: *«Не чакаў, што вачэй блакіт // можа быць для мяне прадоньнем...»; «Не чакаў, што кужэльная каса // абвівае залатым павучыньнем...»; «Бо прыгожай такой, як ты – // яшчэ людзі не ведалі, мусіць...»* [5, с. 18–19]. Аўтар у творы падкрэслівае ўнікальнасць беларускіх дзяўчат: *«Бо гадуюць трысьцё балаты – // бязумоўна ў аднэй Беларусі... »* [5, с. 19].

Вобраз каханай вядучы і ў вершы «Кармазынам асмужаны”, дзе ён пададзены з асаблівым хваляваннем м пяшчотай: *«Ведаеш добра: ты вельмі прыгожая, // вусны твае кармазынам асмужаны. // Вочы ненацкам жыцьцё устрывожылі // і агарнулі сукрыстасьцю кужалю...»* [5, с. 23].

Нечакана ў вершы «І гінулі яны» У. Дубоўкі з’яўляецца вобраз самой Клеапатры – егіпецкай царыцы: *«І гінулі яны за косы Клеапатры, // за вочы тыя, што ня сьняцца нават…»* [5, с. 22], вобраз заморскай царыцы адрозніваецца ад вобразаў беларускіх дзяўчат – тут мы бачым распусную і заганную прыгажосць жанчыны, перад якой мужчына становіцца безабаронным.

Адметна намаляваны жаночы вобраз у вершы «Сінявокая мая». Тут у паэта няма рамантычнага пачуцця – больш праяўляецца сястрынскае стаўленне да дзяўчыны. Аўтар так і называе гераіню – «сястрыца». У цэнтры твора маладая асоба, быццам гераіня «Слуцкіх ткачых» М. Багдановіча, паказана працавітай, стомленай ад ткацтва, адчувае фізічны боль, не бачыць белага свету за кроснамі і шпулькамі. Тут У. Дубоўка таксама не абышоў перанясенне вобраза дзяўчыны на вобраз радзімы. У Беларусі паэт правёў толькі дзіцячыя і юнацкія гады, далей асвойваў навукі ў Маскве. Адтуль, здалёк, ён назірае за лёсам Бацькаўшчыны, марыць наведаць родныя мясціны: *«Ты пра вёску скажаш, я пра гарады... // Дык калі ж прыеду я, дык калі прыеду?..»* [5, с. 31].

Чацвёрты зборнік паэзіі Дубоўка не проста прысвяціў дзяўчыне, але і назваў яе іменем – «Наля» (1927). Хто яна і чаму такое значэнне мае для паэта? *«Спачатку здавалася выпадковым сугуччам – назва кнігі Дубоўкі і літаратурнае імя цяпер малавядомай, а на той час шараговай паэтэсы з Магілёўскай філіі «Маладняка» Налі Маркавай, якое эпізадычна з'яўлялася на старонках беларускага друку 20-х гадоў»* [6, с. 62]. Кім была для Дубоўкі дзяўчына з незвычайным іменем Наля – даведваемся на старонках зборніка. Вобраз дзяўчыны адлюстраваны **ў васьмі творах**. Многія вершы не маюць згадванняў гераіні, усё роўна пэўным чынам звязаны з паэтавай музай.

Вобраз маладой сустракаем ужо ў першым творы зборніка – «Думкі лятуць». У ім паэт разважае наконт хуткаплыннасці часу, жыцця (хоць Дубоўка на момант напісання твора меў каля 26–27 гадоў, але матывы і вобразы набліжэння да восені жыцця ў яго частыя). Разважаючы на такія глыбокія тэмы, аўтар незнарок згадвае дзяўчыну: *«Часам дзяўчына прытуліцца ласкава, // часам ля воч мільгане маіх казкаю...»* [7, с. 5]. У творы гераіня выступае як лекі ад трывогі. Прытуліцца, здзіўлёна паглядзіць – і праходзяць усе перажыванні. У Дубоўкі яна шчырая, непрадказальная.

У вершы «Зубцамі чорных, стрыжаных валос» згадваецца знаёмы з верша «Дзіваваўся і так кахаў» (зборнік «Credo») вобраз – дзяўчына з кароткімі валасамі чорнага колеру, якія нагадваюць паэту «валошку ў жыце». Тут мы даведваемся імя таямнічай асобы і яе паходжанне – *«мая зямлячка ты, мая Маруся... »* [7, с. 29]. У творы паэт расказвае пра юнацкае каханне, якое цяпер «адкрасавала, адцьвіло». Нягледзячы на растанне, Дубоўка ўсё роўна называе яе «любай».

Упершыню ў творах чацвёртага зборніка імя дзяўчыны-загадкі Налі адлюстравана ў вершы «Цягнік спяшаўся». У ім распавядаецца пра растанне з любай. Для перадачы жаночага вобраза паэт выкарыстоўвае славянскі сімвал – каліну: *«І хараство істоту агарнула, // каліна белая... нявеста маладая...»; «Калі водарыла белым цьветам, // каліну звалі тую: Наля... Наля...»* [7, с. 30]. Вобраз каліны-дзяўчыны выглядае пяшчотна, рамантычна: *«Наводля дзеўчына ў кужэльных шатах»; «нявеста маладая»* [7, с. 30].

Сястрынскае стаўленне да жаночага вобраза, як і ў вершы «Сінявокая мая» (зборнік «Credo»), перадаецца і ў творы «А напорна ідзеш, маладая», у якім распавядаецца пра жыццёвыя перашкоды. Аўтар паўстае тут самаахвярным, смелым: *«Я ўзьляту аж да месяца ў высі, // для цябе стуль сузор'е дастану...»* [7, с. 41]. Жанчыну лірычны герой называе «сястрыца», «дзяўчына», «ты». Аўтар перадае ў вершы баявы, натхнёны настрой, гатовы падтрымаць гераіню на жыццёвых пуцявінах.

У зборніку «Наля» ёсць і аднайменная паэма. Асноўныя матывы твора – падзел Беларусі на Заходнюю і Усходнюю, высылка мноства беларусаў у Сібір: *«ты кажаш,*

*беларусаў вельмі шмат // за край-Сібір, на самым Сонца-Усходзе?..»* [7, с. 64]. Мы быццам пранікаем у размову паміж маладымі. Аўтар просіць дзяўчыну расказаць тым, хто адправіўся ў высылку, пра Беларусь. Вобраз дзяўчыны перададзены з асаблівай пяшчотай, замілаваннем, пры дапамозе шматлікіх зваротаў: *«Наля, любая мая»* [7, с. 64].

Такім чынам, паэзія У. Дубоўкі насычана жаночымі вобразамі: каханая дзяўчына, сястрыца, маці, Клеапатра, цыганка. Самы часты вобраз – любая дзяўчына. Жаночыя вобразы ў Дубоўкі разнастайныя – кожная асоба са сваім характарам, адметнасцю, знешнасцю. Вытокі фарміравання сістэмы вобразаў паэзіі У. Дубоўкі, у тым ліку і жаночых, у беларускім традыцыйным фальклоры. Найбольш багатая палітра жаночых вобразаў у чацвёртым зборніку паэта «Наля» (1927), найменш іх – у першым – «Строма» (1923). Калі ў дэбютовай кнізе вобраз жанчыны абстрактны – мара, жаданне, то ў наступных – гэта рэальныя асобы – Маруся, Наля.

Жаночыя вобразы ў паэзіі У. Дубоўкі сведчаць пра душэўныя памкненні літаратара, змены ў светапоглядзе, раскрываюць некаторыя біяграфічныя звесткі мастака слова.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Дубоўка У. Строма: вершы. Вільня: выд. «Нашай Будучыні», 1923.
2. Дубоўка У. О Беларусь, мая шыпшына...: Выбранае. Мінск: Маст. літ., 2002.
3. Дубоўка У. Трысцё: вершы. Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925.
4. Дубоўка У. М. Мой жыццяпіс [Электронны рэсурс] // Пяцьдзесят чатыры дарогі : аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Мінск: Маст. літ., 1963. С. 189–207. URL: http://libpost.of.by/biyagrafiya/ (дата звароту: 20.09.2024).
5. Дубоўка У. Credo: вершы. Менск: выд. ЦБ «Маладняка», 1926.
6. Да 100-годдзя Уладзіміра Дубоўкі, Уладзіміра Жылкі, Кузьмы Чорнага : зб. навук. арт. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т, 2001.
7. Дубоўка У. Наля: вершы. Масква: Цэнтр. выд-ва народаў Саюза ССР, 1927.